ЗАЦВЯРДЖАЮ

Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі

_______________ А.А.Каваленя

“_28_”.01.2026

**ПЛАН**
**мерапрыемстваў, прысвечаных**
**Міжнароднаму дню роднай мовы**

***Міжнародны дзень роднай мовы – штогадовае свята, заснаванае рашэннем Генеральнай сесіі ЮНЕСКА ў 2000 г. Галоўная мэта свята – захаванне моўнай і культурнай шматстайнасці ў свеце, падтрымка нацыянальных моў і культур, а таксама забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.***

**Пляцоўка адкрытых камунікацый «Тыдзень роднай мовы»**

**з 16 па 20 лютага 2026 г.**

| |
|---|
| Інтэрв’ю дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Папко В.М., дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Капылова І.Л. з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы (*тэлеканалы АНТ, Першы нацыянальны канал, Беларусь 3, СТБ; Першы нацыянальны канал Беларускага радыё, канал «Культура» Беларускага радыё; газеты «Звязда», «Літаратура і мастацтва»*).<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л.). |
| Выступленні супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ў рэспубліканскіх СМІ.<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л., загадчыкі аддзелаў). |

**16 лютага 2026 г. (панядзелак)**

| | |
|---|---|
| **10.00** | Творчая сустрэча маладых вучоных НАН Беларусі з пісьменнікам, журналістам, тэлевядучым, радыёвядучым, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Навумам Гальпяровічам **«Я захаваць гатовы кожны гук Адзінай для мяне спрадвечнай мовы»** (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 1003).<br><br>*Падчас сустрэчы будзе абмеркавана шырокае кола праблем, звязаных з мовай мастацкай літаратуры, жыццёвым крэда пісьменніка, сучасным літаратурным працэсам.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (старшыня савета маладых вучоных ПУТРЫЧ А.М., малодшы навуковы супрацоўнік аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі БАСАЛЫГА П.С.). |
| **12.00** | Творчая сустрэча на тэму **«Штучны інтэлект: ці можна з ім размаўляць на роднай мове?»** (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br><br>*Творчая сустрэча галоўнага рэдактара газеты «Навука» С.У.Дубовіка з навуковымі супрацоўнікамі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, студэнтамі ВНУ краіны. Аўтар падзеліцца вопытам стварэння беларускамоўных нейрапесень, іх папулярызацыі ў СМІ.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л.,), рэдакцыя газеты «Навука» (галоўны рэдактар газеты «Навука» ДУБОВІК С.У.). |
| **15.00** | Навукова-практычны семінар для настаўнікаў беларускай мовы Маскоўскага раёна г. Мінска (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br><br>*Семінар скіраваны на знаёмства настаўнікаў з дасягненнямі акадэмічнага мовазнаўства з мэтай іх далейшага выкарыстання ў школьнай адукацыі.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела славістыкі і тэорыі мовы АЛІФЕРЧЫК Т.М.). |

**17 лютага 2026 г. (аўторак)**

| | |
|---|---|
| **09.30** | **«Распрацоўкі сектара камп'ютарнай лінгвістыкі для маладых вучоных».** Сустрэча супрацоўнікаў сектара з маладымі вучонымі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі і выкладчыкамі ВНУ краіны (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br>*Падчас сустрэчы маладыя вучоныя пазнаёмяцца з распрацоўкамі сектара і адкрыюць для сябе новыя магчымасці выкарыстання камп'ютарных тэхналогій у гуманітарных навуковых даследаваннях.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык сектара камп'ютарнай лінгвістыкі КОШЧАНКА У.А.). |
| **11.00** | **«Повязь мовазнаўчай навукі і адукацыі».** Сустрэча супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа і выкладчыкаў мовазнаўчых кафедраў ВНУ Беларусі. Перадача вышэйшым навучальным установам «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br>*Падчас сустрэчы будуць абмеркаваны напрамкі супрацоўніцтва Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа і мовазнаўчых кафедраў ВНУ краіны, перададзены для выкарыстання ў адукацыйным працэсе асобнікі фундаментальнай лінгвагеаграфічнай працы «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак».*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі КУРЦОВА В.М.). |
| **14.00** | Круглы стол **«Славістыка. Этналінгвістыка. Этымалогія»** (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br>*Круглы стол з удзелам навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў скіраваны на папулярызацыю навукі і атрыманне прафесійна-арыентацыйнага досведу.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела славістыкі і тэорыі мовы АЛІФЕРЧЫК Т.М., загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору БОГАНЕВА А.М., загадчык сектара ўсходазнаўства СЕЎРУК Д.Э.). |
| **15.00** | Сустрэча з навучэнцамі 10–11 класаў ДУА «Сярэдняя школа № 26 г. Мінска імя З.Г.Калабанава» (ДУА «Сярэдняя школа № 26 г. Мінска імя З.Г.Калабанава», вул. Льва Сапегі, д. 15).<br>*Сустрэча скіравана на абмеркаванне этапаў фарміравання беларускай мовы і яе сучаснага стану ў беларускім грамадстве.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела славістыкі і тэорыі мовы АЛІФЕРЧЫК Т.М.). |

**18 лютага 2026 г. (серада)**

| | |
|---|---|
| **10.00** | **Гульня-віктарына «Беларускі каляндар»** (ДУА «Дзіцячы сад № 366 г. Мінска», вул. Сурганава, д. 55).<br>*У час мерапрыемства дзеці ў гульнёвай форме даведаюцца пра паходжанне назваў месяцаў у беларускай мове, пра святы і асаблівасці баўлення часу ў кожную пару года.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы ІВАНІЦКАЯ Т.В.). |
| **11.00** | Круглы стол па праблемах перакладазнаўства (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br>*Круглы стол з удзелам навукоўцаў і практыкаў-перакладчыкаў скіраваны на абмеркаванне кола праблем у галіне перакладазнаўства.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (вядучы навуковы супрацоўнік аддзела славістыкі і тэорыі мовы ЯКАВЕНКА Н.В.). |
| **13.00** | Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу навукова-даследчых работ **«Васількоў шапатліваю моваю…»** (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br>*Сумесная ініцыятыва Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, рэдакцыі навуковага і метадычнага часопіса «Роднае слова» і канала «Культура» Беларускага радыё, скіраваная на захаванне духоўнай спадчыны народа, павышэнне моўнай кампетэнцыі носьбітаў беларускай мовы, грамадзянска-патрыятычнае выхаванне і развіццё навукова-даследчых здольнасцей навучэнцаў і студэнтаў.*<br>*Выступленне з прывітальным словам да пераможцаў конкурсу намесніка акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі ЮШКЕВІЧ В.С.*<br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л.), Аб'яднаная галіновая прафсаюзная арганізацыя работнікаў НАН Беларусі (старшыня Аб'яднанай галіновай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў НАН Беларусі БАРАНОЎСКІ І.А.), канал «Культура» Беларускага радыё (дырэктар канала «Культура» КОЛМАК С.М.), рэдакцыя навуковага і метадычнага часопіса «Роднае слова» (галоўны рэдактар навуковага і метадычнага часопіса «Роднае слова» ШАПРАН Н.М.). |

**19 лютага 2026 г. (чацвер)**

| | |
|---|---|
| **11.00** | Рэспубліканскі семінар на тэму **«Слова, кніга, навука: прастора прафесійнага дыялогу»** (Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, вул. Сурганава, 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, пак. 110). |

| | |
|---|---|
| | *Сустрэча вучоных-мовазнаўцаў і бібліятэкараў прысвечана абмеркаванню ролі бібліятэк як найважнейшай прасторы захавання, вывучэння і папулярызацыі моўнай спадчыны. У ходзе дыялогу будуць разгледжаны сучасныя напрамкі лінгвістычных даследаванняў, магчымасці выкарыстання бібліятэчных фондаў і электронных рэсурсаў у навуковай рабоце, а таксама перспектывы супрацоўніцтва бібліятэк і навуковай супольнасці. Асаблівая ўвага будзе нададзена пытанням захавання роднай мовы, развіццю моўнай культуры і сумесным асветніцкім ініцыятывам.*<br>*У семінары прымуць удзел прадстаўнікі бібліятэк розных рэгіёнаў краіны. Падчас сустрэчы Інстытутам мовазнаўства будзе перададзена бібліятэкам унікальнае выданне «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак».*<br><br>*Выступленне з прывітальным словам да ўдзельнікаў семінара вучонага сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі СЫЦЬКО К.В.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л., загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі КУРЦОВА В.М.), Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (дырэктар бібліятэкі ЮРЭЦКІ С.С.). |
| **14.00** | Сустрэча са студэнтамі факультэта журналістыкі БДУ і лінгвістычны квіз «**М**ова**В**еды» (<u>Інстытут гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Акадэмічная, д. 1, 2-і паверх, зала пасяджэнняў</u>).<br><br>*Мэта мерапрыемства – знаёмства студэнтаў з напрамкамі навуковай дзейнасці аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей (прэзентацыя выданняў), павышэнне ўзроўню іх моўнай кампетэнцыі ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей ЯЛЫНЦАВА І.У., старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей МАЛІЦКІ Ю.В., старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей ВАНКЕВІЧ А.Г.), Інстытут гісторыі НАН Беларусі (дырэктар Інстытута гісторыі Лакіза В.Л.). |
| **15.00** | **Мовазнаўчы квіз «Слова да слова – будзе мова»** з удзелам вучняў ДУА «Гімназія № 22 г. Мінска», студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (<u>Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сургана, д. 1, корп. 2, аўд. 302</u>).<br><br>*Падчас мерапрыемства школьнікі і студэнты прадэманструюць і паглыбяць свае веды пра родную мову, яе лексічныя і граматычныя асаблівасці, пакажуць свае творчыя здольнасці, пазнаёмяцца з дзейнасцю і дасягненнямі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі ЛАПЦЁНАК А.М., загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы ПАЛЯШЧУК Н.В., малодшы навуковы супрацоўнік аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі ПУТРЫЧ А.М.). |

| | |
|---|---|
| **15.00** | **Прэзентацыя альбомаў серыі «Фальклорныя скарбы беларусаў» у суправаджэнні выступаў фальклорных калектываў і выставы выцінанкі** (Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, вул. Сурганава, д. 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, аўд. 110).<br><br>*На прэзентацыі будуць прадстаўлены два альбомы «Абярнуся я шэрай зязюляй: беларускія народныя балады» і «“Ой пушчу стралу па ўсяму сялу”: беларускія каляндарна-абрадавыя песні», выступяць укладальнікі, майстры выцінанкі, перакладчык. Выступяць прызнаныя фальклорныя калектывы «Варган» і «Стажары».*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы (загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ВАЛОДЗІНА Т.В.) |

**20 лютага 2026 г. (пятніца)**

| | |
|---|---|
| **12.00** | Лекцыя **«Лексічныя багацці жывой беларускай мовы: навуковыя крыніцы па іх вывучэнні»** (ДУА «Сярэдняя школа № 178 г. Мінска», вул. Усходняя, 68).<br><br>*Лекцыя-прэзентацыя для вучняў старшых класаў ДУА «Сярэдняя школа № 178 г. Мінска» будзе накіравана на знаёмства з выданнямі ў галіне беларускага мовазнаўства, прысвечанымі апісанню багаццяў беларускіх народных гаворак, такімі як слоўнікі, лінгвагеаграфічныя атласы і хрэстаматыі па дыялекталогіі («Дыялекталагічны атлас беларускай мовы», «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», «Тураўскі слоўнік» і інш.), і іх папулярызацыю.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі КУРЦОВА В.М.). |
| **13.00** | **Рэспубліканская дыктоўка па беларускай мове** (Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, вул. Сурганава, д. 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, аўд. 110).<br><br>*Дыктоўка прымеркавана да Міжнароднага дня роднай мовы і Года жанчыны.*<br><br>*Выступленне з прывітальным словам да ўдзельнікаў дыктоўкі намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ДАНІЛОВІЧА В.В.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л., загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі ЛАПЦЁНАК А.М., старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы МАНДЗІК В.А.); Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (дырэктар бібліятэкі ЮРЭЦКІ С.С.); канал «Культура» Беларускага радыё (дырэктар канала «Культура» КОЛМАК С.М.). |

| | |
|---|---|
| **14.00** | Творчая сустрэча навукоўцаў Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа са школьнікамі ДУА «Сярэдняя школа № 140 г. Мінска», ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Жодзіна» і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **«Матуля і мова – з калыскі адное»** (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, аўд. 302).<br><br>*Падчас творчай сустрэчы мовазнаўцы раскажуць аб ролі нацыянальнай мовы ў вучэбным працэсе, пазнаёмяць прысутных з новымі выданнямі. Студэнты і школьнікі выступяць з уласнымі творамі, мастацкімі нумарамі паводле твораў беларускіх аўтараў.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы РУСАК В.П.); Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі ПІСАРЭНКА А.М.); ДУА «Сярэдняя школа № 140 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце КУРБАНАВА С.А.); ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Жодзіна» (настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі ТОЛСЦІК С.М.). |
| **15.00** | Інтэрактыўная лекцыя **«Родная мова, цудоўная мова! Ты нашых думак уток і аснова»** (ДУА «Гімназія з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска», пр. Незалежнасці, д. 45).<br><br>*Падчас мерапрыемства вучні пазнаёмяцца з лексічным багаццем беларускай мовы на прыкладзе твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Міколы Маляўкі, Алеся Бачылы, Пімена Панчанкі, Кастуся Кірэенкі.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы МАРОЗ В.К.). |

**21 лютага 2026 г. (субота)**

| | |
|---|---|
| **9.00** | Лекцыя **«Наша мова – наша спадчына: з гісторыі роднай мовы»** з лінгвістычнай віктарынай (Універсітэт грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, г. Мінск, вул. Машынабудаўнікоў, д. 25, корп. 1).<br><br>*Падчас лекцыі і віктарыны курсанты адновяць свае веды пра мінулае роднай мовы, даведаюцца пра станаўленне яе лексічнага фонду, пазнаёмяцца з помнікамі пісьменнасці, а таксама з асобамі, якія спрыялі развіццю беларускай мовы.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы МАКІТРУК С.М.). |

**23 лютага 2026 г. (панядзелак)**

| | |
|---|---|
| **11.00** | Раённая канферэнцыя даследчых работ навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі **«Родны край у люстэрку навукі»**.<br><br>*На базе Шумілінскага раёна пройдзе канферэнцыя навучэнцаў, у рамках якой будзе працаваць секцыя па мовазнаўстве. У якасці эксперта навукова-даследчых работ па мовазнаўстве выступае дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа І.Л.Капылоў.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л.), аддзел па адукацыі Шумілінскага райвыканкама (начальнік аддзела па адукацыі ТАЛСТАЯ А.Г.). |

**24 лютага 2026 г. (аўторак)**

| | |
|---|---|
| **11.00** | Прэзентацыя **«Крыніца натхнення – Пастаўшчына»** (Пастаўскі райвыканкам, пл. Леніна, д. 25).<br><br>*Прэзентацыя выданняў пастаўчан і пра Пастаўшчыну, арганізаваная Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа і Віцебскай абласной бібліятэкай імя У.І. Леніна.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (дырэктар Інстытута мовазнаўства КАПЫЛОЎ І.Л.), Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна (загадчык аддзела краязнаўства РАГАЧОВА Л.І.). |
| **14.00** | **Інтэрактыўная гульня «Логас»** (Брацтва ў гонар Святога апостала Іаана Багаслова Мінскай епархіі БПЦ, вул. Кірыла і Мяфодзія, д. 5).<br><br>*Інтэрактыўная гульня для школьнікаў пазнаёміць з асноўнымі персанажамі, гісторыямі і каштоўнасцямі Святога Пісьма. Мэта мерапрыемства – папулярызацыя беларускай Бібліі і павышэнне культурнага ўзроўню ведаў вучняў.*<br><br>**Адказныя** – Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа (малодшы навуковы супрацоўнік аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі БАСАЛЫГА П.С.). |

Дырэктар Цэнтра даследаванняў
беларускай культуры, мовы і
літаратуры НАН Беларусі — В.М.Папко